***Кахноўская А. В.**, дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук*

# Стварэнне ўмоў для выхавання духоўна развітой асобы ва ўстанове адукацыі: герменеўтычны і падзейны падыходы

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці стварэння ўмоў ва ўстанове адукацыі для выхавання духоўна развітой асобы на аснове герменеўтычнага і падзейнага падыходаў. Значная ўвага надаецца каляндарна-абрадавым святам як падзеям ва ўстанове адукацыі.

The article discusses the features of creating conditions in an educational institution for the education of a spiritually developed personality on the basis of hermeneutic and event-based approaches. Considerable attention is paid to calendar and ritual holidays as events in an educational institution.

***Ключавыя словы:*** герменеўтычны і падзейны падыходы, каляндарна-абрадавае свята, выхаваўчая прастора.

***Keywords:*** hermeneutic and event approaches, calendar-ritual holiday, space of education.

Выхаваўчая прастора сучаснай установы адукацыі як умова выхавання духоўна развітой асобы з'яўляецца прадметам вывучэння многіх даследчыкаў (А. І. Іваноў, Г. Б. Карнетаў, Ю. С. Майнулаў, Л. І. Новікава, В. У. Пазнякоў, Н. Л. Сіліванава і інш.). Існуюць розныя погляды навукоўцаў на стварэнне выхаваўчай прасторы ва ўстанове адукацыі.

Згодна з меркаваннямі Л. І. Новікавай, эфектыўнасць мадэляў выхаваўчай прасторы залежыць:

– ад асаблівасцей асяроддзя — геаграфічных, гістарычных, культурных;

– наяўнасці адукацыйных устаноў з высокім выхаваўчым патэнцыялам;

– перакананасці адміністрацыі ўстановы адукацыі ў неабходнасці арганізацыі пэўнай выхаваўчай прасторы;

– характару ўключэння дзяцей, педагогаў і сям'і ў працэс стварэння адзінай выхаваўчай прасторы [4].

У сваіх работах Н. Л. Сіліванава адзначае, што герменеўтычны і падзейны падыходы з'яўляюцца прыярытэтнымі пры стварэнні выхаваўчай прасторы. Такога ж меркавання прытрымліваемся і мы ў артыкуле.

Спынімся на *герменеўтычным падыходзе* да стварэння выхаваўчай прасторы, які цесна звязаны ў педагогіцы з феноменам талерантнасці, цярплівасці. Сутнасць падыходу заключаецца ў разуменні дзіцяці, яго матываў, пранікненні ў яго ўнутраны свет. Згодна з герменеўтычным падыходам, выхаваўчая прастора павінна адпавядаць наступным характарыстыкам:

- цэласнасць і стабільнасць як элементаў прасторы, так і сувязей паміж імі пры наяўнасці адзінай педагагічнай канцэпцыі, арыентаванай на прыярытэт гуманістычнага выхавання;
- дыферэнцыяцыя задач і функцый кожнага кампанента і іх інтэграцыя;
- улік палажэння тэорыі самаарганізацыі: у розных фрагментах складанай структуры ўстанаўліваецца аднолькавы тэмп іх развіцця;
- улік «архітэктуры» стварaемага аб'яднання (існуюць тры варыянты такой структуры: першы — у цэнтры школа або група школ, што з'яўляюцца ініцыятарамі стварэння прасторы; другі — усе ўстановы выступаюць як раўнапраўныя стваральнікі прасторы; трэці — у цэнтры ўвагі знаходзіцца любая ўстанова, акрамя школы);
- дыягностыка асяроддзя, улік яго пазітыўнага і негатыўнага патэнцыялаў, вывучэнне калектыўных патрэб і матываў (школа, установа дашкольнай адукацыі, цэнтры дадатковай адукацыі і г. д.) і індывідуальных (дзеці, бацькі, педагогі і інш.) удзельнікаў;
- ініцыятыўная дзейнасць «зверху» (аддзелы адукацыі) і «знізу» (асваенне і прысваенне жыццёвай прасторы дзецьмі на аснове іх асобасных патрэб) [6].

Умовамі эфектыўнага функцыянавання розных мадэляў выхаваўчай прасторы Н. Л. Сіліванава лічыць: наяўнасць мэты, якая падзяляецца ўсімі ўдзельнікамі працэсу яе стварэння; адзіная педагагічная канцэпцыя, арыентаваная на прыярытэты

гуманістычных каштоўнасцей; «мяккая» структура прасторы, яе падзейнасць, дыялогавы рэжым стварэння; разгалінаваная сістэма адносін паміж рознымі кампанентамі, суб'ектамі [6].

*Тэхналогію падзейнага выхавання* адносяць да гуманістычных тэхналогій. Г. Б. Карнетаў адзначае, што выхаваўчая прастора можа стаць фактарам гуманізацыі дзіцячага жыцця і выхавання ў тым выпадку, калі яна будзе прасторай дзіцячай супольнасці, напоўненай рэальнымі і значнымі для дзяцей пытаннямі, на якія неабходна знайсці адказ; калі дзеці ўспрымаюць прастору як сваю ўласную тэрыторыю, за якую яны нясуць адказнасць [2].

Механізмам стварэння выхаваўчай прасторы з'яўляюцца «падзеі», у якасці асноўнага тэхналагічнага моманту якіх разглядаецца сумесная дзейнасць дзяцей і дарослых (Г. Б. Карнетаў). Такія падзеі — гэта своеасаблівыя вехі выхаваўчага працэсу, рэальным момантам, падчас якога адбываецца развіваючая, мэтава- і каштоўнасна-арыентаваная сустрэча дарослага і дзіцяці. Сутнасць падыходу заключаецца ў тым, што педагог павінен разумець дзіця (навучэнца), яго матывы, духоўны свет. Гэты падыход таксама цесна звязаны з феноменам талерантнасці, цярплівасці. Падзейны падыход дазваляе вар'іраваць напрамкі, формы выхавання і праектаваць іх у залежнасці ад інтарэсаў і сацыяльных асаблівасцей дзіцяча-дарослай супольнасці, зместу дзейнасці ўстановы адукацыі. Галоўнае — уключаць дзяцей (навучэнцаў) і дарослых у сферу сумеснай культуратворчай дзейнасці, дзе на аснове «падзей» педагог аказвае выхаваўчае ўздзеянне на дзіця.

На думку даследчыка, «падзеяй» у адукацыйным працэсе ўстановы адукацыі можа стаць нейкая значная, спантанна ўзніклая або спецыяльна сканструяваная сітуацыя, якая забяспечвае яе ўдзельнікам своеасаблівы «псіхалагічны прарыў», выхад за межы жыццёвага вопыту. Роля педагога заключаецца ў кіраванні «падзеяй» як інструментам уздзеяння. «Падзея» звязвае дзяцей і дарослых у адзінае цэлае. Выхаваўчае ўздзеянне ажыццяўляецца не толькі непасрэднымі адносінамі, але і кантэкстам, які задаецца сітуацыяй або «падзеяй». З гэтага пункту гледжання задача педагога заключаецца ў арганізацыі менавіта такіх падзей, якія будуць аказваць пазітыўны ўплыў на асобу дзіцяці (навучэнца) [2]. Стварэнне выхаваўчай прасторы ва ўстанове адукацыі, на нашу думку, павінна грунтавацца на сувязі герменеўтычнага і падзейнага падыходаў.

Асаблівую значнасць ва ўстанове адукацыі ў кантэксце вышэйапісаных падыходаў набываюць народныя каляндарна-абрадавыя святы як яскравыя падзеі ў жыцці дзяцей (навучэнцаў) і дарослых, а таксама як асноўная форма трансляцыі і ўзнаўлення этнічнай культуры беларусаў.

Беларускі народны каляндар — адна з форм духоўнага жыцця нацыі. Гэта сістэма свят, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, ігрышчаў, пэўных забарон, што замацаваліся ў быце і фальклоры беларусаў праз спалучэнне язычніцкіх і хрысціянскіх кампанентаў і з'яўляюцца арыенцірам пры выкананні сельскагаспадарчых работ і адпачынкаў у гадавым, сезонным, месячным цыклах. У народным календары выдзяляюць чатыры пары года і адпаведна чатыры вялікія святы, вакол якіх групуюцца іншыя [3, с. 20]. У сучаснай установе адукацыі народнае свята разглядаецца як «падзея», падчас якой дзеці знаёмяцца з традыцыйным каляндарна-абрадавым зместам, заснаваным, у першую чаргу, на цеснай сувязі чалавека з прыродай, аграрнай тэматыцы або сельскагаспадарчай працы беларусаў (земляробчы каляндар).

Праграма факультатыўных заняткаў «Спадчына» [5], якая можа быць выкарыстана ў адукацыйным працэсе для I–III класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, прадугледжвае стварэнне ўмоў для выхавання духоўна развітой асобы, у тым ліку праз арганізацыю і правядзенне народных каляндарна-абрадавых свят. Асноўная мэта факультатыўных заняткаў — фарміраванне самасвядомасці ў вучняў праз вывучэнне культурнай спадчыны беларусаў. У аснову праграмы закладзена ідэя інтэграцыі зместу з вучэбнымі прадметамі, якія вывучаюцца ў пачатковых класах. І немалаважная роля ў змесце дадзенай праграмы адводзіцца менавіта народным святам, задача якіх — дапамагчы навучэнцам убачыць і пачуць «прыгажосць людзей зямлі беларускай» і іх творчасці, а значыць, і мінулага свайго народа.

Праграмай прадугледжана правядзенне з вучнямі пачатковых класаў наступных каляндарна-абрадавых свят (табл.).

*Табліца*

| № п/п | Назва і сутнасць народнага свята | Клас | | |
|---|---|---|---|---|
| | | I | II | III |
| 1 | Каляды — свята ў гонар зімовага сонцастаяння | + | + | + |
| 2 | Гуканне вясны — дзень сустрэчы вясны | + | + | + |
| 3 | Вялікдзень — вялікае гадавое веснавое свята | + | + | + |
| 4 | Юр'я — земляробчае свята першага выгану кароў на пашу | – | + | + |
| 5 | Сёмуха (Зялёныя святкі) — свята зеляніны і расліннасці | – | + | + |
| 6 | Купалле — старажытнае абрадавае свята сонца і агню | – | + | + |
| 7 | Дажынкі — завяршальны этап жніва | – | + | + |
| 8 | Багатуха (Багач) — старажытнае свята заканчэння ўборкі збожжа, урадлівасці і дастатку | – | + | + |

На святы звычайна выконваліся песні, праводзіліся абрады, ігрышчы, гулялі ў гульні, звязаныя з пэўнымі прыкметамі і павер'ямі. Раскрыем асноўныя паняцці, што выкарыстоўваюцца ў праграме факультатыўных заняткаў «Спадчына»:

*свята* — сукупнасць традыцыйных звычаяў, абрадаў і гульняў, свабодныя ад працы дні (вялікія святы — Каляды, Вялікдзень, Купалле, Багач);

*абрад* — сукупнасць традыцыйных умоўных дзеянняў, што адлюстроўваюць бытавыя ці культавыя звычаі народа (Камаедзіца, абрад пахавання «стралы» і інш.);

*гульня* — від актыўнага адпачынку, гістарычна сфарміраванага на аснове драматызаваных, умоўных або творчых дзеянняў з пэўнымі правіламі і прыёмамі забаў. Яна з'яўляецца сродкам фізічнага, разумовага і маральна-эстэтычнага выхавання. Многія народныя гульні ўзніклі з абрадаў;

*ігрышча* — народнае зборышча, пераважна моладзі, з танцамі, гульнямі, тэатрам, а таксама з частаваннем, адбываецца на вялікія святы [3, с. 22];

*вячоркі* — у адрозненне ад ігрышча, маюць зусім іншы характар. Галоўная мэта іх правядзення заключаецца ў стварэнні ўмоў для пазнання і практычнага засваення культурных каштоўнасцей свята; фарміравання навыкаў зносін дзяцей з педагогамі і аднагодкамі падчас падрыхтоўкі да свята; развіцця асабістых традыцый і стварэння эмацыянальнага камфорту ў сумеснай этнакультуратворчай дзейнасці [1, с. 25].

Падрыхтоўка да свята павінна пачынацца загадзя на спецыяльных вячорках у вольны ад заняткаў час, што дазволіць стварыць атмасферу даверу, дыялогу. Вучні глыбей даведаюцца пра побыт і традыцыі беларускага народа. Удзельнікі вячорак знаёмяцца са зместам і гісторыяй свята, традыцыямі святкавання, абрадавай ежай і інш. На вячорках сумесна абмяркоўваецца праграма арганізацыі свята, вызначаецца для кожнага ўдзельніка месца ў працэсе яго падрыхтоўкі і правядзення. Неабходна прадумаць і спланаваць свята, дакладна вызначыць працу на кожным з этапаў яго арганізацыі: падрыхтоўчым, плануючым, рэалізацыйным, рэфлексіўным [1].

Народныя святы, якія праводзяцца ва ўстанове адукацыі, садзейнічаюць умацаванню пераемнасці паміж пакаленнямі, засваенню культурных традыцый пэўнай мясцовасці. Важна адзначыць станоўчае эмацыянальнае ўздзеянне на вучняў каляндарна-абрадавай паэзіі (фальклору). У працэсе падрыхтоўкі і правядзення народнага свята вучні маюць магчымасць назапасіць уражанні і праявіць мастацкія здольнасці ў танцах, гульнях, чытанні вершаў, тэатралізацыі, вырабе касцюмаў, прыгатаванні традыцыйных беларускіх страў і іншым.

Такім чынам, прастора сучаснай установы адукацыі як умова выхавання духоўна развітой асобы павінна грунтавацца на ўзаемасувязі герменеўтычнага і падзейнага падыходаў. Такі падыход да стварэння выхаваўчай прасторы забяспечыць фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці вучняў праз сістэму ўяўленняў пра беларускую нацыянальную культуру, усведамленне асаблівасцей свайго нацыянальнага жыцця, узаемаадносін з прадстаўнікамі іншых нацыянальных культур.

Цэласнасць і стабільнасць элементаў прасторы пры наяўнасці адзінай педагагічнай канцэпцыі (гадавое кола) забяспечыць сістэмнасць працы па выхаванні духоўна развітой асобы навучэнца. Дыферэнцыяцыя задач і функцый кожнага кампанента выхаваўчай прасторы і іх інтэграцыя дапамогуць рэалізаваць ідэю збліжэння зместу праграмы факультатыўных заняткаў «Спадчына» з вучэбнымі прадметамі, якія вывучаюцца ў пачатковых класах. Улік «архітэктуры» прасторы выхавання, дзе ў цэнтры будзе школа, створыць умовы для арганізацыі «пляцовак» актыўнасці, творчага самаразвіцця, пазнання этнакультурнай спадчыны ўсімі яе суб'ектамі. Дыягностыка асяроддзя, улік яго пазітыўнага і негатыўнага патэнцыялаў, вывучэнне калектыўных і індывідуальных патрэб і матываў суб'ектаў выхаваўчай прасторы забяспечыць рэалізацыю індывідуальнага і дыферэнцыраванага падыходаў да арганізацыі працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Кахноўская, А. В.* Ствараем этнакультурную падзею ў дзіцячым садку: крок за крокам / А. В. Кахноўская // Мастацкая і музычная адукацыя. — 2021. — № 2. — С. 22–28.
2. *Корнетов, Г. Б.* Педагогическая среда: потенциал и проектирование / Г. Б. Корнетов // Шк. технологии. — 2006. — № 3. — С. 23–32.
3. *Лозка, А. Ю.* Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка. — 2-е выд., перапрац. і дап. — Мінск : Полымя, 2002. — 238 с.
4. *Новикова, Л. И.* «Воспитательное пространство» как открытая система (педагогика и синергетика) / Л. И. Новикова, М. В. Соколовский // Обществ. науки и современность. — 1998. — № 1. — С. 132–134.
5. Праграма факультатыўных заняткаў «Спадчына» для I–III класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-programmy-fakultativnykh-zanyatij?format=html. — Дата доступу: 05.09.2023.
6. *Селиванова, Н. Л.* Современные представления о воспитательном пространстве / Н. Л. Селиванова // Педагогика. — 2000. — № 6. — С. 35–38.


*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 12.09.2023.*